ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
24
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 15 (1279)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## ДЗЕЛЯ БУДУЧАГА ПОСПЕХУ

ПАСЛЯ СВАЙГО першага будатрадаўскага лета Алена Верташова назаўсёды палюбіла сонечную Малдавію. А сёлета Алена Верташова, цяпер ужо студэнтка чацвёртага курса, камандзір СБА імя С. Прытыцкага. Нягледзячы на тое, што не скончыліся яшчэ лекцыі і семінарскія заняткі, а наперадзе экзамены, клопаты аб леце не пакідаюць яе і зараз. На першым сходзе атрада быў выбраны камісар — Ларыса Горгуль, студэнтка III курса. У правільнасці выбару сумнявацца не прыходзілася. Ларыса — член КПСС, актывістка. І ўвогуле чулы сябар.

Трывалае ядро атрада склалі тыя, хто ўжо працаваў у СБА. Некаторыя з іх трэці раз запар вырашылі правесці лета ў малдаўскім сяле Копанка, бо ўспаміны аб будатрадаўскім жыцці, аб маляўнічых краявідах рэспублікі засталіся вельмі прыемнымі. Ды і сумаваць не было часу: давалі канцэрты, чыталі лекцыі і галоўнае — працавалі. Даводзілася выконваць самую разнастайную работу: падвязваць вінаграднікі, збіраць перац, яблыкі, памідоры. У сацыялістычным спаборніцтве паміж СБА, якія кожнае лета працуюць тут, атрад імя С. Прытыцкага ўпэўнена займае прызавыя месцы. І сёлета беларускіх студэнтаў з нецярплівасцю чакаюць на малдаўскай зямлі.

Зараз перад байцамі атрада адна задача — трэба на выдатна правесці падрыхтоўчы перыяд. Ужо прачытана шмат лекцый, хутка выйдзе чарговы нумар насценнай газеты «Смуглянка», рыхтуецца да новых выступленняў агітбрыгада. Члены атрада збіраюць кнігі беларускіх аўтараў, якія стануць потым добрым падарункам мясцовай школе. Кожны разумее, што ад таго, як праявіць сябе атрад у падрыхтоўчы перыяд, залежыць і яго далейшая працоўная дзейнасць.

**Т. АЗАРЭВІЧ,**
**студэнтка III курса факультэта журналістыкі.**

**ПАЗЫЎНЫЯ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА**

## НА БУДОЎЛІ РОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

### ФІЗФАК

СЁЛЕТА на кафедры фізікі паўправаднікоў створаны атрад імя акадэміка С. І. Вавілава, які будзе працаваць у Мінскай вобласці.

Работа ў атрадзе ідзе поўным ходам. Актыўна працуе агітбрыгада, праведзены два нядзельнікі на будаўніцтве алімпійскіх аб'ектаў: стадыёна «Дынама» і інтэрната № 7.

**А. ЛАЎРЫНЕНКА,**
**член рэдкалегіі СБА імя С. І. Вавілава.**

### ГІСТФАК

БАЙЦЫ СБА імя Гарыбальдзі, створанага на базе II курса гістарычнага факультэта, з вялікім энтузіязмам праводзяць падрыхтоўчы перыяд. Асаблівасцю атрада з'яўляецца тое, што ён першы інтэрнацыянальны атрад на факультэце. Побач з савецкімі студэнтамі ўдарна працуюць у ім і студэнты з Лаоса, Грэцыі, В'етнама.

Але падрыхтоўчы перыяд — гэта не толькі рэпетыцыі агітбрыгады, лекцыі ў школах і на прадпрыемствах. Гэта праверка асабістага ўмення працаваць. У час суботніка кожны баец атрада адпрацаваў па 10 гадзін. Суботнік яскрава паказаў, што ўжо ў падрыхтоўчы перыяд атрад стаў добрым калектывам.

**М. МАСЮЧЭНКА,**
**баец СБА імя Гарыбальдзі.**

ЗВЫШ 48 тысяч рублёў капіталаўкладанняў трэба асвоіць байцам атрада «Вікторыя» другога курса гістарычнага факультэта, які будзе сёлета выконваць шэраг будаўнічых работ па добраўпарадкаванню комплексу па вытворчасці таварнай свініны ў гарадскім пасёлку Копыль Мінскай вобласці. Камандзір атрада А. Жыльскі ўпэўнены, што з гэтай задачай атрад паспяхова справіцца.

Зараз байцы СБА «Вікторыя» паспяхова выконваюць сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя на падрыхтоўчы перыяд.

**А. АЛЯКСЕЕЎ,**
**студэнт II курса гістфака.**

### ФПМ

«ТАВАРЫШ пазнаецца ў працы», — так рашылі байцы студэнцкага будаўнічага атрада факультэта прыкладной матэматыкі «Магістраль» і выйшлі на суботнік у адну з сярэдніх школ Мінска. Нягледзячы на дрэннае надвор'е зменнае заданне было выканана паспяхова.

**А. НЕДАСТУП.**



**Хімічны факультэт — база для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў не толькі для нашай краіны. Разам з савецкімі студэнтамі тут займаецца і замежная моладзь. Вопыты, даследаванні — аб усім гэтым яны будуць расказваць сваім вучням на Радзіме, над вырашэннем шматлікіх праблем у галіне хіміі будуць працаваць, скончыўшы БДУ.**

**НА ЗДЫМКУ: пяцікурснік хімфака Касцільё РОДЭРЫК і інжынер кафедры будовы рэчываў А. І. УРУБЛЕЎСКІ за даследаваннем кінетыкі фотахімічных рэакцый з удзелам парфірынаў.**

## НАВІНЫ БДУ

### ЗЛЁТ ВЫДАТНІКАЎ

**БДУ імя У. І. Леніна прайшоў у клубе імя Дзяржынскага. Ён прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзю камсамола Беларусі. Камсамольцы яшчэ раз пацвердзілі сваю вернасць ленінскім запаветам.**

**На злёце лепшыя студэнты універсітэта былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі, каштоўнымі падарункамі.**

**А. АБРАМОВІЧ,**
**студэнт V курса факультэта радыёфізікі і электронікі.**

### НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

**прайшла на хімічным факультэце. На ёй было зроблена больш як 170 дакладаў на 4 мовах, што ў 1,3 раза больш, чым у мінулым годзе.**

**У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел госці з фізічнага факультэта нашага універсітэта, з БТІ імя С. М. Кірава, БПІ, педінстытута імя А. М. Горкага і Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя І. Франко. Канферэнцыя ўнесла вялікі ўклад у развіццё студэнцкай навукі на факультэце і расшырэнне міжвузаўскіх сувязей.**

**А. ВЕЧАР,**
**студэнт хімічнага факультэта.**

### ЗАВЯРШЫЎСЯ ДРУГІ ТУР

**Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», які праходзіў у БТІ імя С. М. Кірава. У ім прынялі ўдзел 135 чалавек з 22 вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Выдатна выступіла каманда студэнтаў хімічнага факультэта нашага універсітэта — яна падзяліла першае і другое месцы з камандай БТІ імя С. М. Кірава.**

**Трывалыя веды паказаў студэнт першага курса хімфака В. С. Гурын, які заняў у асабістым заліку першае месца па неарганічнай хіміі.**

**А. АЛЯКСАНДРАЎ.**

● ВУЧОБА

## 90 хвілін актыўнасці

ШЛЯХ ДА ДЫПЛОМА пачынаецца тут: на лекцыях, на практычных занятках. І, вядома, не кожны падручнік можа замяніць цікава прачытаную лекцыю альбо дыскусію на семінары. Калі размова кранае ўсіх, то і час бяжыць хутка, і след глыбейшы ў памяці застаецца. Даволі часта бывае так, што студэнты застаюцца пасіўнымі толькі да таго часу, пакуль пытанне, вынесенае на абмеркаванне ў якасці тэмы практычных заняткаў, не будзе гучаць абстрактна. Калі ж студэнт дадасць да прачытанага нешта сваё, звяжа адказ з сучаснасцю, правядзе прыклад са свайго ўласнага вопыту і г. д., пасіўнасці не будзе. Але бывае і наадварот: здаецца ж, рыхтаваліся напярэдадні хлопцы і дзяўчаты, сур'ёзна рыхтаваліся, а размовы няма.

Быў у нас семінар па дзяржаўнаму праву. Забягаючы наперад, скажу, што пасля заканчэння заняткаў прафесар, загадчык кафедры дзяржавы і права Анатоль Аляксандравіч Галаўко адзначыў:

— Калі б нашу сённяшнюю дыскусію запісаць на плёнку (толькі так, каб ніхто не бачыў), я ўпэўнены, што вы б са мной згадзіліся. Згадзіліся ў тым, што толькі тады, калі кожны выказвае сваю думку, неабавязкова правільную, можна пазбегнуць памылак і знайсці ісціну.

...Цяжка прымусіць працаваць чалавека, які ўвесь час чакае, што за яго зробяць іншыя. І на практычных занятках такому зусім не цяжка, тым больш, калі ёсць надзейная «абарона». Але ж нам, вядома, не патрэбны ні паказная актыўнасць, ні паказныя веды. Кожны павінен займацца так, каб потым не даводзілася выказваць прэтэнзій да вышэйшай школы за шматлікія белыя плямы ў тэорыі і практыцы.

Вяртаючыся да семінара, які праводзіў А. А. Галаўко, трэба сказаць, што ён праходзіў даволі актыўна. Асабліва шмат жадаючых выступіць было тады, калі Анатоль Аляксандравіч прапанаваў нам абмеркаваць пытанне «Асабістая ўласнасць пры сацыялізме». Найбольш рэальнымі і глыбокімі былі думкі Дар'і Лебедзевай, Віктара Хвясені, Сяргея Шухно, Ірыны Жылко і Сяргея Полха. Так, не ўсё было правільна ў адказах. Але ж пазбавіцца калектыўна ад памылак значна лягчэй, чым аднаму, тым больш, што ўсе неадхопы ў разважаннях выступаючых былі ў канцы заняткаў дэталёва прааналізаваны Анатолем Аляксандравічам.

Дыяпазон актыўнасці... Вельмі добра, калі ён расшыраецца ў адпаведнасці са здабытымі ведамі, калі гэтая прамая прапорцыя расшыраецца з уключэннем у лік актыўных усё новых і новых юнакоў і дзяўчат. І дзякуй за гэта цікава прачытанай лекцыі і цікава праведзеным практычным заняткам.

**У. ПОБАЛЬ,**
**студэнт I курса юрыдычнага факультэта.**

# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

## ГІСТОРЫІ



КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ і Савецкі ўрад заўсёды аддавалі і аддаюць вялікую ўвагу падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці. Завочная форма навучання — зручны шлях павышэння кваліфікацыі для тых, хто працуе па выбранай спецыяльнасці, і добрая магчымасць набыць новую спецыяльнасць.

На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта ў цяперашні час навучаецца 300 студэнтаў. Ідзе падрыхтоўка гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства для агульнаадукацыйных школ і сярэдніх спецыяльных устаноў. Многія выпускнікі аддзялення гісторыі працуюць экскурсаводамі ў экскурсійных і турысцкіх арганізацыях, навуковымі супрацоўнікамі архіваў, музеяў і навукова-даследчых інстытутаў, у партыйных, савецкіх і камсамольскіх органах.

Вучэбны план для завочнікаў разлічаны на 6 гадоў навучання. Па сваіму зместу ён амаль не адрозніваецца ад вучэбнага плана стацыянара. Два разы ў год (у студзені і ліпені) студэнты-завочнікі збіраюцца на сесіі. У гэты час яны слухаюць лекцыі, наведваюць семінарскія і практычныя заняткі, атрымліваюць кансультацыі у выкладчыкаў, здаюць залікі і экзамены. У перыяд паміж сесіямі студэнты-завочнікі выконваюць кантрольныя і курсавыя работы, самастойна рыхтуюцца да экзаменацыйных сесій. Здаваць экзамены дазваляецца і ў дні завочніка.

Пачынаючы з 4-га курса студэнты размяркоўваюцца згодна са сваімі інтарэсамі па групах спецыялізацыі для больш паглыбленага вывучэння аднаго з напрамкаў гістарычнай навукі. На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта студэнты могуць спецыялізавацца па гісторыі КПСС, гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай і навейшай гісторыі, гісторыі рэлігіі і атэізму, археалогіі і этнаграфіі. Кожная спецыялізацыя здзяйсняецца сіламі адной ці дзвюх кафедр, супрацоўнікі якіх чытаюць спецыяльныя лекцыйныя курсы, праводзяць спецсемінары па найбольш актуальных пытаннях гісторыі. У рамках спецыялізацыі студэнты падбіраюць і выконваюць тэмы сваіх курсавых і дыпломных работ.

На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта ў цяперашні час працуе аўтарытэтны калектыў выкладчыкаў, сярод якіх 9 дактароў гістарычных навук, прафесараў, больш 30 кандыдатаў гістарычных навук, дацэнтаў. 10 дактароў навук працуюць на кафедрах грамадскіх навук універсітэта, якія таксама вядуць заняткі са студэнтамі - завочнікамі. Высокі навуковы патэнцыял, вялікі вопыт вучэбна - метадычнай работы прафесарска - выкладчыцкага калектыву гістарычнага факультэта дазваляе паспяхова весці падрыхтоўку кадраў беларускіх савецкіх гісторыкаў.

Студэнты аддзялення гісторыі завочнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце і навуковым жыцці універсітэта. Штогод дзесяткі студэнтаў-завочнікаў выступаюць на студэнцкіх навуковых канферэнцыях. Многія з іх прымаюць удзел і дабіваюцца высокіх вынікаў на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

**І. ЦАРУК,**
**дэкан гістарычнага факультэта, прафесар.**

## ПРАВАЗНАЎСТВА



ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасці правазнаўства на дзённым і вячэрнім аддзяленнях (і на юрыдычным аддзяленні завочнага факультэта). Тэрмін навучання на дзённым аддзяленні 5 гадоў, на вячэрнім і завочным—6 гадоў. Пры паступленні на дзённае аддзяленне перавагай карыстаюцца асобы, якія маюць працоўны стаж не менш 2 гадоў, а таксама звольненыя з радоў Савецкай Арміі, якія праслужылі не менш 2 гадоў. Пры паступленні на вячэрняе аддзяленне юрыдычнага факультэта і на юрыдычнае аддзяленне завочнага факультэта перавагай на залічэнне карыстаюцца асобы, якія працуюць на пасадах, што адносяцца да профілю спецыяльнасці правазнаўства (пералік усіх пасад маецца ў прыёмнай камісіі).

За час навучання студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па грамадскіх навуках: гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі і навуковаму камунізму. Студэнты вывучаюць і ўсе спецыяльныя дысцыпліны, якія прадугледжаны вучэбным планам па спецыяльнасці правазнаўства: тэорыю дзяржавы і права, гісторыю палітычных вучэнняў, гісторыю дзяржавы і права замежных краін, гісторыю дзяржавы і права СССР, савецкае дзяржаўнае права, дзяржаўнае права замежных сацыялістычных краін, дзяржаўнае права капіталістычных краін і краін, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, савецкае адміністратыўнае права, савецкае будаўніцтва, суд і правасуддзе ў СССР, пракурорскі нагляд у СССР, асновы рымскага дзяржаўнага права, савецкае дзяржаўнае права, савецкае сямейнае права і прававую ахову прыроды, савецкае працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння, калгаснае права, савецкі дзяржаўны працэс, савецкае крымінальнае права, савецкае выпраўленча-працоўнае права, савецкі крымінальны працэс, крыміналістыку, міжнароднае права, псіхалогію (агульную і спецыяльную), судзебную статыстыку, асновы бухгалтарскага ўліку і судзебна-бухгалтарскай экспертызы, судзебную медыцыну, судзебную псіхалогію.

Падрыхтоўка спецыялістаў здзяйсняецца па трох спецыяльнасцях: дзяржаўна-прававой, гаспадарчай і судзебна-пракурорска-следчай. Выпускнікі факультэта дзяржаўна-прававой спецыялізацыі накіроўваюцца на работу ў выканкомы мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а гаспадарча-прававой спецыялізацыі — у міністэрствы, ведамствы, вытворчыя аб'яднанні, на прадпрыемствы, ва ўстановы і арганізацыі для работы юрысконсультамі. Выпускнікі судзебна-пракурорска - следчай спецыялізацыі працуюць у органах юстыцыі, пракуратуры, МУС.

Па кожнай спецыялізацыі студэнтам чытаюцца спецыяльныя курсы.

На факультэце ёсць сем спецыяльных кафедраў: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, дзяржаўнага і сямейнага права, дзяржаўнага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права, крымінальнага працэсу, крыміналістыкі. Усе кафедры ўкамплектаваны высокакваліфікаванымі спецыялістамі. У іх ліку 7 дактароў і 36 кандыдатаў юрыдычных навук.

Многія з выпускнікоў юрыдычнага факультэта працуюць у Вярхоўным судзе Беларускай ССР, Пракуратуры БССР, Міністэрстве юстыцыі БССР, у абласных і народных судах, пракурорамі абласцей і раёнаў, следчымі пракуратуры і МУС БССР, адвакатамі, начальнікамі прававых аддзелаў міністэрстваў і ўстаноў, прававых служб вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў і арганізацый.

**В. ЧЫГІР,**
**дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар.**

## ФІЛАСОФІІ

НА АДДЗЯЛЕННІ ФІЛАСОФІІ завочнага факультэта навучаецца каля 300 студэнтаў. Яны атрымліваюць шырокую грамадскую адукацыю, вывучаюць шэраг філасофскіх дысцыплін, марксісцка-ленінскую метадалогію, гісторыю культуры, этыку, эстэтыку і г. д. Працэс духоўнага развіцця розных краін, усяго чалавецтва раскрываецца пры вывучэнні курсаў гісторыі філасофіі пачынаючы з старажытных часоў і да нашых дзён. Кожнае новае пакаленне філосафаў, спасцігаючы агульныя законы развіцця прыроды, грамадства і мыслення, шукае адказы на пытанні аб паходжанні свету, аб адносінах паміж быццём і свядомасцю, узбройваецца дыялектычным метадам пазнання. У гэтым ім дапамагаюць лекцыі прафесараў Г. П. Давідзюка, А. С. Кляўчэні, В. С. Сцёпіна. У вучэбны план уключаны таксама асновы вышэйшай матэматыкі, фізікі, біялогіі і іншых прыродазнаўча-навуковых дысцыплін.

Тых, каго прыцягвае філасофія, хто жадае даведацца аб тайнах яе гісторыі, мы шчыра запрашаем на аддзяленне філасофіі завочнага факультэта.

Пачынаючы з 4-га курса прадугледжваецца спецыялізацыя студэнтаў па дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму, а таксама па этыцы і навуковаму атэізму.

Усебаковая гуманітарная адукацыя, высокая ідэйна-тэарэтычная падрыхтоўка робяць выпускнікоў - філосафаў спецыялістамі шырокага профілю. Выпускнікі аддзялення працуюць выкладчыкамі філасофіі, грамадазнаўства, этыкі, эстэтыкі ў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, сацыёлагамі на прадпрыемствах і ва ўстановах, у савецкім, партыйным і камсамольскім апараце.

Навучальны працэс на аддзяленні забяспечваюць супрацоўнікі кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі філасофіі і логікі, навуковага камунізму, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, палітычнай эканоміі.

**А. КЛЯЦКОЎ,**
**намеснік дэкана гістарычнага факультэта, дацэнт.**

## ФІЛАЛОГІІ



ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ запрашае на вучобу тых, хто любіць родную мову і літаратуру, жадае стаць выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ці выкладчыкам рускай мовы і літаратуры.

Адзін са старэйшых і буйнейшых ва універсітэце, філалагічны факультэт мае багатыя і слаўныя традыцыі ў навучанні і выхаванні творчай моладзі. Яны звязаны з навукова - педагагічнай дзейнасцю на факультэце вядомых вучоных і пісьменнікаў—народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, акадэміка АН БССР І. І. Замоціна, прафесараў Я. І. Барычэўскага, А. М. Вазнясенскага, М. М. Піятуховіча, П. А. Бузука і іншых, якія шмат зрабілі для развіцця лінгвістычнай і літаратуразнаўчай навукі ў БССР, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай асветы, навуковых і культурных устаноў рэспублікі. Гэтыя традыцыі свята захоўвае і памнажае прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта, у саставе якога цяпер налічваецца 125 чалавек, у тым ліку 11 прафесараў і дактароў філалагічных навук, 73 дацэнты і кандыдаты навук. Сярод іх вядомыя пісьменнікі, паэты, крытыкі, члены Саюза пісьменнікаў СССР і БССР: прафесары Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, М. Р. Ларчанка, С. Х. Александровіч, дацэнты Д. Я. Бугаёў, В. П. Рагойша, Р. М. Семашкевіч, П. І. Ткачоў і іншыя.

**На факультэце сем кафедр: беларускай мовы (загадчык прафесар Л. М. Шакун), беларускай літаратуры (загадчык дацэнт В. В. Казлова), рускай мовы (загадчык прафесар П. П. Шуба), рускай класічнай літаратуры (загадчык дацэнт П. І. Ткачоў), рускай савецкай літаратуры (загадчык дацэнт І. П. Кахно), агульнага і славянскага мовазнаўства (загадчык прафесар А. Я. Супрун), замежнай літаратуры (загадчык дацэнт І. В. Шаблоўская).**

Вучэбна-выхаваўчы працэс на завочным факультэце ажыццяўляюць тыя ж выкладчыкі, якія працуюць на стацыянары і вячэрнім аддзяленні. Яны дапамагаюць студэнтам-завочнікам набыць трывалыя і багатыя веды па вывучаемых дысцыплінах, авалодаць методыкай выкладання мовы і літаратуры, а таксама набыць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы.

Студэнты - завочнікі вывучаюць тыя ж дысцыпліны вучэбнага плана і ў тым аб'ёме, што і студэнты стацыянара, толькі колькасць гадзін, адведзеных на іх вывучэнне, некалькі меншая. Гэта і зразумела, бо вучэбны працэс на завочным факультэце адрозніваецца ад стацыянарнага навучання тым, што ён падзяляецца на вучэбна-экзаменацыйныя сесіі і перыяд міжсесійнай самастойнай працы студэнтаў.

Значнае месца ў вучэбным плане студэнтаў-завочнікаў адводзіцца прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Таму яны павінны авалодаць глыбокімі ведамі па сучаснай беларускай і рускай мове, гісторыі беларускай і рускай літаратуры, методах іх выкладання, старaславянскай мове, культуры мовы, рускай і беларускай дыялекталогіі, фальклору, тэорыі літаратуразнаўства, агульнаму мовазнаўству і інш.

**Вялікае значэнне надаецца на факультэце вывучэнню грамадскіх дысцыплін, якія заклікаюць фарміраваць у студэнтаў марксісцка - ленінскі светапогляд і выхаваць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм, гісторыя СССР і БССР, марксісцка-ленінская філасофія і г. д. Акрамя гэтага, студэнты-філолагі вывучаюць лацінскую мову, замежныя мовы (англійскую, нямецкую, іспанскую, французскую), літаратуру народаў СССР і замежную літаратуру (літаратуру краін Еўропы, Азіі і Амерыкі), шэраг дысцыплін па спецыялізацыі, праходзяць вучэбна-педагагічную практыку.**

Завочнікам чытаюцца лекцыі, праводзяцца практычныя і семінарскія заняткі. Вучонымі факультэта створаны шэраг падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак для студэнтаў завочнага навучання. Выкладчыкі даюць рэкамендацыі, як лепш арганізаваць самастойнае вывучэнне матэрыялу, як выконваць кантрольныя і курсавыя работы, як рыхтавацца да залікаў і экзаменаў. Гэта робіцца не толькі ў час правядзення залікова-экзаменацыйных сесій. Штомесячна на факультэце праводзяцца дні завочніка, у час якіх можна атрымаць кваліфікаваную кансультацыю, датэрмінова здаць залік ці экзамен, сустрэцца з кіраўніком курсавой ці дыпломнай работы.

Шматгадовая практыка сведчыць аб тым, што выхаванцы завочнага факультэта з'яўляюцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-філолагамі, якія з гонарам носяць высокае і пачэснае званне настаўніка. Многія з выпускнікоў-завочнікаў сталі вядомымі вучонымі, дзеячамі культуры, пісьменнікамі.

**М. ПІПЧАНКА,**
**намеснік дэкана філалагічнага факультэта, дацэнт.**

# ЗАПРАШАЕ НА АДДЗЯЛЕННІ:

# ЖУРНАЛІСТЫКІ



БЕЛАРУСКІ дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ў наступным годзе адзначыць сваё 60-годдзе і ў гэты час у 37-ы раз гасцінна адчыніць свае дзверы факультэт журналістыкі, створаны ў 1944 годзе па пастанове ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава - палітычнай і культурна-асветнай работы сярод насельніцтва». Факультэт, такім чынам, стаў першынцам падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў ва універсітэтах нашай краіны.

**За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў каля 2500 работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, газетчыкаў, работнікаў радыё і тэлебачання, кіно, выдавецтваў. Многія яго выпускнікі сталі вядомымі партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі работнікамі, грамадскімі дзеячамі, пісьменнікамі, вучонымі. Сёння практычна няма ніводнага месца ў рэспубліцы, дзе б не працавалі нашы выхаванцы.** Факультэт закончылі загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, кандыдат гістарычных навук С. Я. Паўлаў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, міністр культуры рэспублікі Ю. М. Міхневіч, старшыня Дзяржкамвыдавецтва БССР М. І. Дзялец, старшыня Дзяржкіно БССР У. В. Мацвееў, старшыня Дзяржтэлерадыё БССР Г. М. Бураўкін, сакратар Мінскага АК КПБ Р. П. Платонаў, Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Філімонаў, загадчык карэспандэнцкага пункта «Праўды» па Беларусі, лаўрэат дзяржаўнай прэміі БССР імя П. М. Лепяшынскага І. Р. Новікаў.

З кожным годам факультэт набірае сілу. Расце колькасць выкладчыкаў, павышаецца іх кваліфікацыя. Умацоўваецца матэрыяльна - тэхнічная база. Асабліва гэта прыкметна пасля пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» (20 студзеня 1975 года). Калі ў пяцідзесятыя гады ва універсітэце існавала адна кафедра — журналістыкі, на якой працавалі некалькі выкладчыкаў, то цяпер іх чатыры: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання. Кафедры ўзначальваюць вядомыя беларускія вучоныя—прафесары Р. В. Булацкі, Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі, дацэнт Я. Р. Радкевіч. Сёння на факультэце працуе 31 выкладчык, з іх 6 прафесараў і 16 дацэнтаў. Акрамя названых, гэта прафесары Е. Л. Бондарава, В. А. Пыжкоў, А. І. Наркевіч, дацэнты С. М. Грабчыкаў, А. І. Раковіч, Н. А. Сніцарава, І. І. Сачанка, А. А. Плаўнік, Т. Д. Арлова, Л. Ф. Шылава і іншыя.

Факультэт размяшчаецца ў новым прыгожым вучэбным корпусе. Тут ёсць вучэбны клас машынапісу, фоталабараторыя, радыё- і тэлестудыя, пачалося абсталяванне вучэбнай тыпалабараторыі.

**Па новаму вучэбнаму плану больш глыбока вывучаюцца грамадска-палітычныя, агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны — тэорыя марксізму-ленінізму, гістарычны вопыт КПСС, унутраная і знешняя палітыка партыі і ўрада, партыйнае і савецкае будаўніцтва, савецкае права, тэорыя і практыка буржуазнай журналістыкі, метады ідэалагічнай работы, прыкладная сацыялогія. Студэнты факультэта вывучаюць рускую, беларускую, замежную мову і літаратуру, практычную стылістыку і літаратурнае рэдагаванне, гісторыю рускай, партыйна-савецкай, замежнай камуністычнай і рабочай журналістыкі, тэорыі і практыкі журналістыкі і РТ, тэхніку газетнай справы, журналісцкае майстэрства.**

Журналіст павінен глыбока разбірацца ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, таму на факультэце значная ўвага ўдзяляецца вывучэнню актуальных праблем сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, комплекснай праграмы ідэйнага выхавання і інш.

Студэнты факультэта выпускаюць вучэбную газету «Журналіст» і альманах «Творчасць журналіста», працуюць у гуртках студэнцкага навуковага таварыства, удзельнічаюць у спартыўных секцыях і гуртках мастацкай самадзейнасці. А колькі цікавага даюць ім сустрэчы са старэйшымі калегамі па пяру, партыйнымі і савецкімі работнікамі, вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі, рэжысёрамі. Трэба сказаць, што ў гэтай рабоце ўдзельнічаюць і студэнты завочнага аддзялення.

Аддзяленне журналістыкі завочнага факультэта з'яўляецца вядучым. На мой погляд, студэнты-завочнікі маюць нават нейкую перавагу перад студэнтамі стацыянара, бо тут, як правіла, займаюцца тыя, хто паспрабаваў «журналісцкай кухні». Вучоба на факультэце дапаможа набыць ім тэарэтычныя веды і расшырыць практычныя навыкі.

Правілы паступлення на аддзяленне журналістыкі агульныя, з той толькі розніцай, што тут патрабуюцца характарыстыка-рэкамендацыя ад рэдакцыі газеты, часопіса, радыё, тэлебачання, а таксама шэраг апублікаваных матэрыялаў.

**Другі год мы будзем набіраць на завочнае аддзяленне 75 чалавек (раней было 50). У першую чаргу пры ўмове паспяховай здачы ўступных экзаменаў будуць залічаны штатныя супрацоўнікі газет, радыё, тэлебачання.**

У заключэнне хацелася б яшчэ раз напомніць нашым абітурыентам, што журналіст— гэта перш за ўсё актыўны баец партыі, які павінен быць палітычна сталым чалавекам, глыбока разбірацца ва ўсіх з'явах грамадскага жыцця, здольным да навуковага абагульнення іх і аб'ектыўнага аналізу, быць чалавекам, які мае светлы розум, яснасць у поглядах, валодае добрым стылем, многа ведае, цікава і па-свойму піша. Журналіст павінен заўсёды быць на хвалі часу, умець глыбока асэнсоўваць і адлюстроўваць жыццё нашага сучасніка, яго духоўнае багацце.

У папулярнай песні пра журналістаў ёсць словы: «Трое суток шагать, трое суток не спать ради нескольких строчек в газете...». Добрыя словы, бо журналістыка — гэта не толькі (і не столькі) рамантыка, колькі штодзённая нялёгкая і карпатлівая праца. У гэтай працы трэба быць моцным і маральна і фізічна.

І ўсё ж як бывае радасна, калі тваё слова дапамагло чалавеку стаць лепшым, калі яно хоць на невялікую часцінку прыблізіла нашу светлую будучыню.

У. І. Ленін яшчэ ў гады першай рускай рэвалюцыі назваў журналістаў летапісцамі рэвалюцыі. Тым самым ён падкрэсліў і высокі грамадскі статус журналіста, і яго высокі грамадскі абавязак. Хацелася б, каб тыя, хто ідзе на наш факультэт, заўсёды памяталі пра гэта. І калі вы гатовы поўнасцю прысвяціць сябе служэнню людзям, мы чакаем вас на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

**С. ГОВІН,**
**в. а. намесніка дэкана факультэта журналістыкі, дацэнт.**

---



# БІЯЛОГІІ

У САСТАЎ БІЯЛАГІЧНАГА факультэта ўваходзіць восем кафедраў: біяхіміі, батанікі, мікрабіялогіі, агульнай экалогіі, заалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, дарвінізму і генетыкі, фізіялогіі раслін.

Больш дзвюх тысяч выпускнікоў факультэта працуюць у сферы навукі, вытворчасці, народнай адукацыі. Сярод іх — член-карэспандэнт АН СССР, доктар біялагічных навук Л. М. Сушчэня, доктар біялагічных навук М. С. Долбік, 19 заслужаных настаўнікаў БССР — Н. Д. Станкевіч, М. П. Далёнак, Н. С. Цвяткова, А. Р. Адзінец і інш. Многія з іх закончылі завочнае аддзяленне біяфака.

Выпускнікі гэтага аддзялення Р. В. Куневіч, кандыдат біялагічных навук, узначальвае лабараторыю імунітэту ў адным з навукова-даследчых інстытутаў, С. Л. Баброўскі, кандыдат біялагічных навук, — намеснік дырэктара па навуцы Ганусаўскай вопытна-селекцыйнай станцыі, Ф. Ф. Кахманюк — дацэнт Брэсцкага педінстытута і іншыя. Больш як 30 выпускнікоў завочнага факультэта працуюць у народнай асвеце.

На завочнай форме навучання падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца ў двух напрамках. З аднаго боку, студэнты-завочнікі маюць магчымасць павысіць узровень біялагічных ведаў і прафесіянальнае майстэрства настаўніка біялогіі і хіміі, з другога — набываюць тэарэтычныя і практычныя веды работнікаў біялагічных і медыка-біялагічных навуковых устаноў.

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы біёлагаў іграюць летнія вучэбныя практыкі, якія праводзяцца на І і ІІ курсах на біястанцыі возера Нарач. У выніку практык студэнты-завочнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з фаунай і флорай Беларусі.

Спецыялізацыя студэнтаў-завочнікаў пачынаецца з IV курса. Яна вядзецца па профілях асноўных кафедраў. У выніку спецыялізацыі студэнты знаёмяцца з шэрагам спецыяльных дысцыплін, а таксама выконваюць дзве курсавыя работы, якія накіраваны на атрыманне эксперыментальных матэрыялаў для напісання дыпломнай работы.

Кафедры факультэта імкнуцца максімальна наблізіць спецыялізацыю студэнтаў да іх асноўнай работы. Для настаўнікаў—гэта тэмы, звязаныя з педагагічнай работай, для студэнтаў, якія працуюць у навуковых установах,—тэмы, блізкія да іх работы. Паказчык сур'ёзных вынікаў навуковай работы студэнтаў-завочнікаў — удзел многіх з іх у рэспубліканскіх аглядах-конкурсах навуковых работ.

Вынікі дзяржаўных экзаменаў, аналіз работы выпускнікоў-біёлагаў завочнага факультэта даюць магчымасць лічыць, што біяфак рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням.

**А. ШУКАНАЎ,**
**в. а. дэкана біялагічнага факультэта, дацэнт.**

# ГЕАГРАФІІ



ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ— вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў, таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых, праектных і вытворчых установах і арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

**У саставе факультэта сем кафедраў і дзве лабараторыі: праблемная навукова-даследчая лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства.**

**Студэнты завочнага факультэта набываюць спецыяльнасці: фізічная геаграфія або эканамічная геаграфія. Студэнты-завочнікі, таксама як і студэнты дзённага і вячэрняга аддзяленняў, вывучаюць грамадскія і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, шырокае кола геаграфічных дысцыплін. Усе студэнты слухаюць лекцыі па агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глеб, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, геадэзіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, агульнай тапаніміцы, геаграфіі БССР, гісторыі і метадалогіі геаграфічнай навукі і інш.**

Акрамя таго, фізікі-географы вывучаюць геахімію і геафізіку ландшафтаў, фізіка-геаграфічнае раянніраванне і карціраванне, агракліматалогію і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. У ліку спецкурсаў, якія чытаюцца для эканаміка-географаў, — эканамічная геаграфія, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, эканамічнае раяніраванне, статыстыка, раённая планіроўка.

**Важным відам вучэбнай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў - географаў з'яўляюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна» — месца правядзення ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры карпусы інтэрната, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыя. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічныя здымкі мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебы, вызначаюць форму і размеры ўзгоркаў, нізін, іх паходжанне, вядуць назіранні за надвор'ем і г. д.** Заключным этапам з'яўляецца комплексная геаграфічная практыка, якая ўключае комплексную характарыстыку прыродных умоў насельніцтва і гаспадаркі раёна. Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў увязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі выконваюцца курсавыя і дыпломныя работы.

Як і студэнты стацыянара, завочнікі прымаюць удзел у навукова - даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, прадстаўляюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс. Работа з завочнікамі знаходзіцца пад пастаянным кантролем і ўвагай прафесарска-выкладчыцкага калектыву факультэта. Лекцыйныя, практычныя і семінарскія заняткі праводзяць вядучыя спецыялісты кафедраў. Нярэдка для чытання лекцый запрашаюцца вучоныя АН БССР, Маскоўскага, Ленінградскага і іншых універсітэтаў.

У час вучобы завочнікі карыстаюцца літаратурай і вучэбнымі дапаможнікамі бібліятэкі універсітэта і кабінетаў пры кафедрах. Для іх ёсць метадычныя дапаможнікі і распрацоўкі па асобных прадметах. Высокі навукова-метадычны ўзровень лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў, групавыя і індывідуальныя кансультацыі, гутаркі ў міжсесійны перыяд і дні завочніка, неабходная дапамога і кантроль за арганізацыяй самастойнай работы садзейнічаюць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**М. РАМАНОЎСКІ,**
**дэкан геаграфічнага факультэта, прафесар.**

# СПОРТ

ХАКЕЙ

## СЕЗОН ЗАКОНЧЫЎСЯ — ПРАБЛЕМЫ ЗАСТАЮЦЦА

ПРАЙШЛА ЗІМА, а разам з ёю закончыўся хакейны сезон. Якім ён быў для нашай універсітэцкай зборнай? Адказ на гэта пытанне не задавальняе — шостае месца ў першынстве рэспублікі сярод ВНУ. І не задавальняе таму, што пяць—сем год назад зборная БДУ была лідэрам беларускага студэнцкага хакея. Што ж здарылася з камандай? У чым справа?

Цяжка адназначна адказаць, бо прычын шмат. І адна з іх— састаў каманды. У гэтым годзе, напрыклад, у яго ўваходзяць толькі сем студэнтаў. У фінале першынства, які нядаўна завяршыўся, была закінута ўсяго адна (!?) студэнцкая шайба. Асноўнае ядро каманды складаюць выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, сапраўдныя патрыёты гэтага віду спорту, якія шмат гадоў прысвяцілі любімай гульні. І таму сярэдні ўзрост каманды, безумоўна, перарос студэнцкі — 25—26 год. Пагадзіцеся, што гэта выклікае ўсмешку.

А дзе ж рэзерв? Уладзімір Савельеў і Юрый Літвін—вось і ўсе таленавітыя хакеісты, якія прыйшлі ў калектыў за апошнія гады. Гэта яшчэ раз сведчыць аб недахопах у падборы здольных хакеістаў. Вось толькі адзін факт.

Сем год назад па прычынах, якія нельга назваць аб'ектыўнымі, хакей быў выключаны з праграмы зімняй спартакіяды БДУ. Не стала магчымасці адбіраць здольных хлопцаў з факультэцкіх каманд. А дарэмна, бо той, хто прыходзіць у секцыю па свайму жаданню, хоча, у першую чаргу, навучыцца гуляць у хакей. Аднак пяці студэнцкіх год хопіць толькі для таго, каб дасягнуць сярэдняга ўзроўню...

Ці ёсць выхад з гэтага становішча? На мой погляд, ёсць. Перш за ўсё кожны год трэба праводзіць ва універсітэце хакейнае першынство, трэба значна палепшыць падбор маладых, таленавітых хакеістаў з ліку першакурснікаў і нават старшакласнікаў, якія мараць паступіць у БДУ. Упэўнены, што вынікі такой працы будуць плённымі: добрыя хакейныя традыцыі універсітэцкай каманды будуць працягвацца.

**А. ДАБРЫЯН,**
**студэнт 1-га курса факультэта журналістыкі.**

ВАЛЕЙБОЛ

## Кубак прапісаны ў БДУ

У пачатку красавіка мацнейшыя жаночыя каманды Мінска спаборнічалі за ганаровы прыз — кубак горада па валейболу.

З першай жа гульні валейбалісткі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна зрабілі добрую заяўку на права валодаць кубкам горада. З лікам 3:0 яны абыгралі каманду трэста «Прамбуда». Наступны сапернік — іграці каманды інстытута фізкультуры. У дзвюх першых партыях у вельмі напружанай барацьбе каманда БДУ атрымлівае перамогу. Канцоўку трэцяй гульні больш паспяхова праводзяць іграці ІФК і заканчваюць яе ў сваю карысць. Лік становіцца 2:1. Іграці разумеюць, што чацвёртая партыя можа стаць рашаючай для дзвюх каманд, і аддаюць гульні ўсе сілы. Нашы дзяўчаты арганізавалі настолькі шчыльны блок, што праціўнік нічога не змог зрабіць. Студэнткі універсітэта вельмі добра гуляюць у абароне, нястрымна атакуе Наташа Касянкова. Гэту партыю, а з ёю і ўсю сустрэчу выйграла каманда універсітэта і трапіла ў фінал. У фінале яе сапернікам была каманда педінстытута, у якой зараз сабраліся вопытныя іграці. Да таго ж, на мінулых спаборніцтвах першынства горада перамаглі дзяўчаты педінстытута. Нашы валейбалісткі правялі ўсю гульню з вялікім уздымам і выйгралі тры партыі запар. Перамога! У камандзе, якая выйграла кубак горада Мінска 1980 года, выступалі студэнткі факультэта прыкладной матэматыкі Наталля Баўрына, Лілія Паўлоўская, Святлана Хоміч, Алена Багданава, выпускніцы гэтага факультэта Ларыса Дубовік, Марыя Кунцэвіч, прадстаўнікі хімфака Наталля Касянкова і Ірына Рамашко, гісторык Таццяна Кандрацьева.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**

ПРЭССАЎТАКЛУБ ПРЕССА СССР

## КРАСАВІЦКІЯ ЭКЗАМЕНЫ

ВЯСНА — гэта перш за ўсё шмат сонца, цяпла і кветак. Але мы, работнікі аўтаінспекцыі, прывыклі вызначаць прыход вясны па іншых прыкметах. У гэту пару звычайна ажыўляюцца гарадскія вуліцы, больш шчыльнымі становяцца транспартныя патокі. Вясной, як правіла, павялічваецца колькасць дарожных здарэнняў. Не выпадкова таму па ўсёй нашай краіне ў красавіку праводзіцца агляд бяспекі руху. Ён прыўрочаны да пачатку найбольш інтэнсіўнага руху транспарту. Пасля зімовага перапынку за руль садзіцца шматтысячная армія ўладальнікаў асабістых аўтамабіляў і матацыклаў. За зіму многія з іх страцілі ўпэўненасць у кіраванні транспартнымі сродкамі. Папаўшы ў складаную дарожную сітуацыю, яны часта бываюць не ў стане выканаць неабходныя дзеянні. Трэба адзначыць, што ў вясенне-летні перыяд па віне аўтааматараў робіцца кожнае трэцяе здарэнне на дарозе.

Галоўнай фігурай на вуліцы, як вядома, з'яўляецца пешаход. Ад строгага прытрымлівання ім правіл у многім залежыць бяспека руху. Але паводзіны пешахода на вуліцы па-ранейшаму пакідаюць жадаць лепшага. Ужо ў гэтым годзе 161 парушэнне зарэгістравана за студэнтамі і супрацоўнікамі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Недапушчэнне падобных выпадкаў, дысцыплінаванасць на дарозе — вось што патрабуецца як ад вадзіцеля, так і ад пешахода ў перыяд агляду бяспекі руху.

Агляд — не адзіны красавіцкі экзамен. У гэтым жа месяцы пачаўся гадавы тэхнічны агляд транспарту індывідуальнага карыстання. Ён будзе праходзіць да 30 жніўня. Зараз ДАІ паступае шмат пытанняў, якія датычаць тэрмінаў і парадку правядзення агляду. Карыстаючыся выпадкам, тлумачым: вадзіцель, прадстаўляючы свой транспарт на агляд, павінен мець пры сабе наступныя дакументы: асабісты пашпарт, тэхнічны пашпарт, талон тэхнічнага пашпарта (пры наяўнасці прычэпа), вадзіцельскае пасведчанне і медыцынскую даведку.

Абавязковай умовай лічыцца наяўнасць знакаў аварыйнага прыпынку, медыцынскай аптэчкі, рамянёў бяспекі. Рэкамендуецца ўстаноўка вогнетушыцеляў.

Дык ці ўсё вы прадугледзелі па падрыхтоўцы сваёй машыны да першых вясенніх паездак? Калі ўсё, то ў добры шлях!

**Р. АЎРАМЕНКА,**
старшы інспектар ДАІ горада Мінска.

## ● ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ ●

**ШКАДА было б з ім не сустрэцца. Цікавы чалавек...**

**Віктар Хвалюк — імя і прозвішча гэтага студэнта. Вучыцца на пятым курсе хімфака, ленінскі стыпендыят. Працаваць прыходзіцца шмат — навука не любіць гультаёў. Хімія неахвотна раскрывае свае таямніцы, але дапытлівая думка студэнтаў не супакойваецца. Вось зусім нядаўна стаяла пытанне, як прадоўжыць тэрмін годнасці бессярэбранага фотаматэрыялу. А цяпер адказ ёсць. Віктар Хвалюк дабіўся таго, што гэты матэрыял будзе выкарыстоўвацца на працягу доўгага часу. Вельмі цікава было паглядзець і на бессярэбраныя здымкі, зробленыя Віктарам. Гэта невялікае дасягненне, невялікая знаходка, як гаворыць сам Віктар, але яно дае падставу для пазнання іншых тайн хіміі.**

**І. ЦАЛУЙКА.**
Фота аўтара.





**НА ЗДЫМКУ: студэнт V курса фізічнага факультэта Аляксандр ЦІМАШЭНКА. Выдатную вучобу ён паспяхова спалучае з навуковай працай. Аляксандр вядзе даследаванні ў галіне біяфізікі.**
Фота А. Жолудзь.

ДА 60-ГОДДЗЯ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ПІШАМ ГІСТОРЫЮ

НАБЛІЖАЕЦЦА значная дата — у 1981 годзе нашаму універсітэту спаўняецца 60 гадоў. Мы, студэнты гістарычнага факультэта, імкнёмся ўнесці свой уклад у дастойную сустрэчу гэтага юбілею. Наш факультэт — адзін са старэйшых. Гісторыя яго — адлюстраванне шляху універсітэта за гэтыя гады. На нашым факультэце па ініцыятыве выкладчыка кафедры гісторыі філасофіі і логікі дацэнта М. І. Іоські створаны навуковы гурток па напісанню гісторыі факультэта. У работу актыўна ўключыліся студэнты ўсіх трох аддзяленняў факультэта. Мэта першага этапа работы — збор матэрыялаў аб рабоце кафедр факультэта—своеасаблівае падвядзенне вынікаў іх работы за прайшоўшыя гады.

Нягледзячы на насычаную вучэбную праграму алімпійскага года ахвотна збіраюць матэрыялы па гісторыі кафедр Віктар Вабішэвіч і Алег Міхеенка з аддзялення гісторыі, Ірына Ляшчынская, Людміла Назарэнка, Вольга Гусева з аддзялення філасофіі, Наталля Янушковіч з аддзялення паліт-эканоміі. Спіс гэты можна працягваць. Вядома, ёсць пэўныя цяжкасці. У прыватнасці са складаннем поўнай бібліяграфіі работ, але яны пераадольваюцца дзякуючы актыўнай дапамозе калектываў кафедр. Ёсць усе падставы спадзявацца, што ствараемая намі гісторыя факультэта стане добрым падарункам да 60-годдзя роднага універсітэта.

**М. ЖБАНКОЎ,**
**студэнт II курса гістарычнага факультэта.**


## АБ'ЯВЫ

**Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола, прафком Белдзяржуніверсітэта аб'яўляюць КОНКУРС на лепшыя эскізы юбілейнага настольнага медаля, значка і вымпела універсітэта.**

**Эскізы прымаюцца ў камітэце камсамола (ауд. 308) да 10 чэрвеня 1980 г. Пераможцаў конкурсу чакаюць каштоўныя падарункі.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 11232 Заказ 684.

24 красавіка 1980 г.



220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19



Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ